5. *Дитятин, И. И.* Столетие Санкт-Петербургского городского общества 1785–1885 гг. / И. И. Дитятин. – СПб.: Тип. Шрейдера, 1885. – 403 с.
6. ПСЗРИ. Собрание 1-е: Т. 23. – СПб., 1830. – 1034 с.
7. *Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (IX – пачатак XX ст.): курс лекций / А. Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акад. МУС, 1996. – 205 с.
8. ПСЗРИ. Собрание 1-е: Т. 24. – СПб., 1830. – 1083 с.
9. Магдэбургскае права на Беларусі: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 500-годзю выдачы гораду Мінску граматы на Магдэбургскае права (Мінск, 26 сак. 1999 г.) / пад рэд. акад. М. В. Касцюка – Мінск: Ін-т гісторыі, 1999. – 258 с.
10. ПСЗРИ. Собрание 1-е: Т. 22. – СПб., 1830. – 1168 с.
11. *Немировский, А.* Реформа городского самоуправления / А. Немировский. – СПб., 1908. – 172 с.
12. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 299. – Оп. 1. – Д. 208.
13. НИАБ. – Фонд 182. – Оп. 1. – Д. 1.
14. *Кизеветтер, А. А.* Местное самоуправление в России IX–XIX ст. / А. А. Кизеветтер. – СПб., 1910. – 250 с.
15. *Кизеветтер, А. А.* Городовое положение Екатерины II 1785 г. / А. А. Кизеветтер. – М., 1909. – 473 с.
16. НИАБ. – Фонд 2506. – Оп. 1. – Д. 1.
17. НИАБ. – Фонд 151. – Оп. 1. – Д. 13.
18. НИАБ. – Фонд 1168. – Оп. 1. – Д. 2.
19. НИАБ. – Фонд 149. – Оп. 3. – Д. 1.
20. НИАБ. – Фонд. 24. – Оп. 1.– Д. 1.
21. *Вишневский, А. Ф.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30–50-е гг. XIX в.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А. В. Вишневский. – Минск, 1973. – 172 с.
22. НИАБ. – Фонд 168. – Оп. 2. – Д. 8.
23. НИАБ. – Фонд 2506. – Оп. 1. – Д. 1.
24. НИАБ. – Фонд 152. – Оп. 1. – Д. 13.
25. *Шелкопляс, В. А.* Минский городовой магистрат в 1795–1805 гг. / В. А. Шелкопляс // Вестник БГУ. Сер. 3. – Минск, 1972. – Т. 2. – С. 68–73.
26. НИАБ. – Фонд 18. – Оп. 1. – Д. 12.

**(Дата подачи: 19.02.2016 г.)**

*Г. Х. Базарэвіч*
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск
*G. H. Bazarevich*
Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk

**УДК 94(476.5) "1921/1922": 364.682 (470.4)-053.2**

# АРГАНІЗАЦЫЯ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ З ПАВОЛЖА НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ (1921–1922 ГГ.)

# ORGANIZATION OF HELP FOR CHILDREN FROM THE VOLGA REGION IN VITEBSK PROVINCE (1921–1922)

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць дзяржаўных органаў, арганізацый і грамадзян Віцебскай губерні па аказанні дапамогі дзецям, якія былі эвакуіраваныя з галадаючых*

*раёнаў у 1921–1922 гг. На матэрыялах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці паказаны механізмы арганізацыі дзіцячых дамоў, уладкавання дзяцей пад прыватнае патранаванне, утрымання выхаванцаў прафесійнымі саюзамі, арганізацыямі, падраздзяленнямі Чырвонай Арміі Віцебскай губерні.*

*Ключавыя словы: голад 1921 г.; Віцебская губерня; эвакуацыя дзяцей; патранаванне; дзіцячыя дамы; апякунства; прафесійныя саюзы.*

*The article discusses the activities of state bodies, organizations and citizens of the Vitebsk province to assist children who have been evacuated from the hungry regions in 1921–1922. The mechanisms of the organization of children's homes, children's unit under the private patronage, the content of the pupils by trade unions, organizations, units of the Red Army of the Vitebsk province is shown using the materials of the State Archives of Vitebsk region.*

*Key words: famine of 1921; Vitebsk province; the evacuation of children; patronage; orphanages; guardianship; trade unions.*

У пачатку 1920-х гг. беларускія землі, як і ўся Савецкая дзяржава, знаходзіліся на шляху да развіцця і станаўлення ў новых умовах. Змена сацыяльна-эканамічнай палітыкі і новыя формы гаспадарання значна паўплывалі на сітуацыю, якая склалася ў рэспубліцы. Сукупнасць такіх фактараў, як наступствы Грамадзянскай вайны, нізкі ўзровень сельскай гаспадаркі, падатковы ціск на сялянства, засуха 1921 г., прывяла да знішчэння ўраджаю на некалі багатых і хлебных тэрыторыях Паволжа, Урала, Сібіры, Поўдня Украіны, Паўночнага Каўказа, што пацягнула за сабой узнікненне голаду. З 30 млн насельніцтва мясцовасцей, што былі ахоплены неўраджаем, налічвалася 12 млн дзяцей, з якіх 8–9 млн былі галадаючымі [1, с. 6]. Перад краінай паўсталі першачарговыя задачы па ліквідацыі  наступстваў голаду – выратаванне насельніцтва ад пакутніцкай смерці і забеспячэнне пасяўной кампаніі ў пацярпелых губернях. І першае, і другое вымагала вялікіх сродкаў, а мясцовыя рэсурсы былі поўнасцю знішчаны.

Сукупнасць мер, якія здзейсніў урад для ліквідацыі наступстваў голаду, кансалідаваўшы грамадскія сілы, мае шырокі спектр. Дзеля выратавання было вырашана эвакуіраваць дзяцей  у больш ураджайныя губерні Савецкай Расіі, саюзныя рэспублікі і замежжа. У гэты час тэрыторыя Беларусі была падзелена літаральна паміж трыма рэспублікамі і знаходзілася адначасна па абодва бакі мяжы: паміж капіталістычным і сацыялістычным светам. Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы ў сакавіку 1921 г. заходнія землі Беларусі знаходзілася ў складзе Рэспублікі Польшча, цэнтральная частка ў складзе шасці паветаў утварала Беларускую ССР, а паўночныя і паўночна-ўсходнія тэрыторыі адміністрацыйна прадстаўлялі Гомельскую, Магілёўскую і Віцебскую губерні РСФСР.

У дадзеным артыкуле разгледжаны адзін з асноўных кірункаў дапамогі, якая была аказана пацярпелым ад голаду, – сацыяльны клопат пра дзяцей, якіх эвакуіравалі ў Віцебскую губерню. У справе выратавання былі задзейнічаны амаль усе дзяржкамітэты, установы і прадпрыемствы, прафесійныя саюзы, падраздзяленні Чырвонай Арміі і грамадзяне.

Віцебскі губернскі камітэт па аказанні дапамогі галадаючым (далей – Губкамітэт) быў арганізаваны ў ліпені 1921 г. На адным з першых пасяджэнняў ён пастанавіў падрыхтавацца да наплыву бежанцаў, прыёму дзяцей і інвалідаў. Адпаведна папярэднім прагнозам Віцебская губерня рыхтавалася прыняць да 5 тыс. дзяцей і да 2,5 тыс. інвалідаў [2, арк. 1].

Праца праходзіла ў цяжкіх умовах, бо патрабавала наяўнасці вялікіх памяшканняў для пасялення, працоўнай сілы і фінансавых сродкаў. Перасяленцаў планавалася размясціць часткова ў Віцебску, часткова размеркаваць па ўездах. Становішча ўскладнялася тым, што прыбываючыя не мелі ні цёплай вопраткі, ні абутку, чым Губкамітэт быў не ў стане своечасова іх забяспечыць. Ва ўмовах нізкіх восеньскіх тэмператур затрымлівалася разгрузка цягнікоў на станцыях Віцебска, і перапраўка на падводах і параходах ва ўезды была немагчымай. З-за складанай сітуацыі Віцебск прасіў змяніць маршрут санцягніка, які накіроўваўся ў губерню з Казані [3, арк. 7]. Службы не спраўляліся з наплывам бежанцаў, і Губкамітэт прызнаў нежыццяздольнасць планаў па прыёме людзей і іх размеркаванні, пра што сведчыць даклад ва Усерасійскі цэнтральны камітэт па аказанні дапамогі галадаючым пры УЦВК Саветаў: «Со стороны Витгубисполкома было ошибкой о запросе 5 тыс. детей голодающих губерний, когда работа только началась. Но губерния раскачалась, уезды расшевелились и по прибытии первого санпоезда началась лихорадочная работа» [2, арк. 3]. І за чатыры месяцы атрымалася дасягнуць пэўных вынікаў. У канцы лістапада 1921 г. як планава, так і самацёкам прыбылі 7974 чалавекі, з іх на ўтрыманні Губкамітэта знаходзілася 2147 дзяцей і 1095 інвалідаў [2, арк. 1].

Прыём эвакуіраваных дзяцей у Віцебскую губерню накладаў вялікія абавязкі на службы. Першыя гадзіны пасля прыбыцця санцягнікоў патрабавалі мабільнай арганізацыі харчавання і медыцынскай дапамогі. Наступным крокам было стварэнне дзіцячых дамоў, для чаго патрабаваліся памяшканні, абсталяванне, неабходныя сродкі для побыту і ўтрымання. Дзеля таго, каб вызваліць месцы ў існуючых дзіцячых дамах, рэкамендавалася скараціць колькасць выхаванцаў, аднак гэтага было недастаткова [4, арк. 1]. Пошук новых памяшканняў для пасялення значнай колькасці дзяцей прывёў да высновы аб прыгоднасці для гэтых мэтаў манастыроў Віцебска і ваколіц. Каардынаванне гэтай працай ажыццяўляла адмыслова створаная Камісія па ўладкаванні дзяцей галадаючых губерняў. У пачатку верасня 1921 г. быў агледжаны Тадулінскі жаночы манастыр і прынята рашэнне арганізаваць у яго памяшканнях дзіцячы дом для дзяцей галадаючых губерняў, дзе можна было размясціць каля 150 чалавек. Манахіням, якія жылі ў манастыры, было прапанавана ў тыднёвы тэрмін пераехаць ва ўласны фальварак і пакінуць увесь манастырскі інвентар на карысць арганізуемай установы [4, арк. 5]. Ужо ў канцы лістапада 1921 г. тут утрымлівалася 146 дзяцей.

У выніку перапаўнення дзіцячых дамоў у Віцебску прыступілі да арганізацыі ўстановы для дзяцей галадаючых губерняў у мужчынскім ма-

настыры ў Маркаўшчыне. Справа пачыналася амаль з нуля: памяшканне не было далучана да электрычнай лініі, працы па падрыхтоўцы памяшканняў не былі завершаныя, бо скончыліся сродкі. Патрабаваліся абсталяванне, прадметы побыту, адзенне, былі выкарыстаны амаль усе рэсурсы. Тым не менш дзіцячы дом у Маркаўшчынскім манастыры прыняў дзяцей, якія прыбылі ў Віцебск, памяшканне было абсталяванае пад усе патрэбы і далучана да электрычнай лініі [5, арк. 108]. У перыяд з 1 жніўня 1921 г. па 1 лістапада 1922 г. Віцебск узяў пад поўную апеку 578 дзяцей [6, арк. 38].

Уезды губерні паведамлялі звесткі пра магчымую колькасць дзяцей, якія яны здольныя былі прыняць. Большая колькасць дзяцей была размеркавана па ўсходніх уездах губерні, найменшую колькасць прынялі Дрысенскі, Полацкі ўезды, на ўтрыманні якіх у лістападзе 1921 г. знаходзілася па 90 едакоў [5, арк. 105]. Адначасна з уладкаваннем дзяцей на тэрыторыі губерні распачалася перапіска з бацькамі і роднымі прыбыўшчых. Была арганізавана бясплатная перасылка лістоў і паштовых картак ад дзяцей да сваякоў. «Галоднае дзіцячае пісьмо» дазвалялася адпраўляць раз на месяц [7, арк. 41].

Санітарныя цягнікі з эвакуіраванымі прыбывалі ў Віцебск разам з суправаджаючым персаналам. Выхавацелі часта заставаліся разам са сваімі падапечнымі, харчаваліся з аднаго катла з выхаванцамі і атрымлівалі заробак з Уезднага аддзела народнай адукацыі, у ведамстве якога знаходзілася ўстанова. У некаторых выпадках баланс паміж колькасцю выхаванцаў у дзіцячых дамах і персаналам быў парушаны. Напрыклад, у Невельскім 2-м гарадскім дзіцячым доме ўтрымлівалася 25 выхаванцаў, на якіх прыходзілася 12 чалавек персаналу, у Чэрняцоўскім (Чэрняцоўская воласць, Невельскі ўезд) дзіцячым доме на 10 дзяцей прыходзілася 12 чалавек персаналу [7, арк. 10]. Гэта парушала прынцып: на 30 дзяцей павінна быць 4 педагога і 2 тэхнічных работніка. Да таго ж у дзіцячым доме павінна было ўтрымлівацца не менш за 20–30 дзяцей, у адваротным выпадку ўстанова падлягала ліквідацыі, а дзеці размеркаванню. Каб пазбегнуць нямэтавага марнавання сродкаў, было прынята рашэнне аб скарачэнні штату, а таксама работнікаў «паволжскіх» дзіцячых дамоў, якія не адпавядалі свайму прызначэнню. Аднак пры скарачэнні персаналу і наяўнасці аднолькавых якасцей перавага аддавалася супрацоўнікам, якія прыбылі з Паволжа [7, арк. 16].

У канцы 1921 г. стала зразумелым, што ні Губернскі камітэт па аказанні дапамогі галадаючым, ні Губернскія аддзелы сацыяльнага забеспячэння і народнай адукацыі не ў стане ўтрымліваць дзіцячыя дамы. Звесткі, што падаваліся ў зводках аб колькасці дзяцей, якія маглі быць прынятыя ў інтэрнаты, што знаходзіліся ў ведамстве аддзела народнай адукацыі, пацвярджаюць перапоўненасць большай часткі ўстаноў уездаў [8, арк. 1]. Сродкаў, якія выдзяляліся дзяржавай, было недастаткова, патрабавалася новае рашэнне. Аднак з’явіўся новы рэсурс: жаданне арганізацый і гра-

мадзян узяць дзяцей пад сваю апеку. 21 снежня Віцебскі губернскі аддзел народнай адукацыі разаслаў цыркулярныя лісты ўездным аддзелам народнай адукацыі губерні з інфармацыяй пра станоўчае вырашэнне пытання аб патранаванні і распараджэннем ускласці перадачу дзяцей на сваё ведамства [9, арк. 48].

Дзяцей узяць пад сваю апеку маглі грамадзяне, якія звярнуліся са сваім жаданнем у мясцовыя аддзелы народнай адукацыі і былі прызнаныя падыходзячымі кандыдатурамі для часовага апякунства [9, арк. 51]. Асобы, якія займаліся саматужніцтвам і гандлем, не маглі браць дзяцей на патранаванне [9, арк. 48].

Жаданне сялянства ўзяць дзяцей часта было абумоўлена пачаткам сезонных прац: дзяўчат бралі ў якасці служанак, а хлопцы павінны былі быць годнымі ў пастухі [9, арк. 32, 43]. Яшчэ перад пачаткам працэсу перадачы дзяцей на патранаванне ўстанаўліваліся правілы, якія павінны былі папярэдзіць такую сітуацыю. Нагляд за ўмовамі жыцця дзяцей ажыццяўлялі школьныя інспектары і ўрачы, а ў тых выпадках, калі асоба, якая прымала дзіця, не магла выконваць апякунскіх абавязкаў, то для выхавання і абароны інтарэсаў дзіцяці назначаўся выхавацель (калектыўны апякун) з мясцовых педагогаў [9, арк. 51]. Тым не менш паступалі звесткі пра эксплуатацыю дзяцей сялянамі. Па заканчэнні палявых прац стала відавочным, што не апошнюю ролю ў прыняцці дзяцей пад апеку мела мэтанакіраваная эксплуатацыя дзіцячай працы, выпадкі якой фіксаваліся камісіямі [7, арк. 111]. Аднак з наступленнем восені дзяцей пачалі вяртаць назад, зноў паўстала пытанне аб адкрыцці дзіцячых дамоў. Паўторная арганізацыя патрабавала каласальных сродкаў, таму што дзеці вярталіся з-пад патранажу не забяспечаныя ні прадуктамі, ні адзеннем. Такім чынам, перад апекунамі, якія вырашылі вярнуць дзяцей, ставіліся ўмовы аб снабжэнні дзяцей як адзеннем, так і прадуктамі, якія былі патрэбныя выхаванцу для жыцця на працягу зімы [7, арк. 108].

Апякунства над дзецьмі з боку прафесійных саюзаў, установаў і падраздзяленняў Чырвонай Арміі ажыццяўлялася ў рознай ступені: з поўным пакрыццём утрымання пэўнай колькасці дзяцей у дзіцячых дамах альбо арганізацый інтэрнатаў пры ўстанове. Па ўтрыманні дзяцей у Саюзе Савецкіх работнікаў за Віцебскай губерняй была замацаваная Уфімская губерня: Губфінаддзел браў на ўтрыманне 5 дзяцей [7, арк. 108]. Па 5 выхаванцаў даручалася Віцебскаму ваеннаму і Лужаснянскаму сельскагаспадарчым тэхнікумам [11, арк. 41]. Віцебскі прафесійны саюз работнікаў лячэбна-санітарных спраў адкрываў дзіцячы дом на 20 асоб [4, арк. 51].

Значную колькасць дзяцей бралі на ўтрыманне падраздзяленні Чырвонай Арміі. У Дрысенскім уездзе 5-ты кавалерыйскі полк браў пад апеку 30 дзяцей [11, арк. 29]. 44 полк па заканчэнні абсталявання памяшкання казармы быў гатовы прыняць 20 дзяцей [11, арк. 6]. Чырвонаармейцы бронецягніка бралі 3 дзяцей пад сваю апеку, нягледзячы на асцярогі, што

сярод чырвонаармейцаў дзеці будуць выхоўвацца дрэнна [4, арк. 39]. Былі выпадкі, калі Губнарабраз адмаўляў у просьбе перадаць дзяцей на ўтрыманне. Так, напрыклад, санітарная частка 5-й стралковай Віцебскай дывізіі ўтрымлівала 30 дзяцей, аднак умовы жыцця выхаванцаў былі недапушчальныя. Нягледзячы на гэта штаб дывізіі жадаў прыняць пад сваю апеку яшчэ 100–130 дзяцей менавіта з Раслаўя. У той час Віцебская губерня прызнавалася перапоўненай дзецьмі з галадаючых раёнаў, і эвакуацыя была спынена. Больш за тое, дывізія з’яўлялася мабільнай і рухомай установай, і ў выніку пераводу дывізіі ў іншае месца дзеці застануцца на ўтрыманні Губернскага аддзела народнай адукацыі. Улічваючы ўсе гэтыя фактары, у просьбе было адмоўлена і прапанавана пры наяўнасці свабодных рэсурсаў узяць на ўтрыманне дзяцей з Маркаўшчынскага дома дзяцей Паволжа [11, арк. 48].

З канца 1922 г., калі становішча ў галадаючых раёнах палепшылася, пачало разглядацца пытанне аб рээвакуацыі дзяцей. У першую чаргу гэта датычылася дзяцей, у якіх меліся сваякі, што маглі прыняць іх на радзіме. У выпадку, калі сваякі адсутнічалі, адпраўка магла ажыццяўляцца толькі па ўзгадненні з губернскім аддзелам народнай адукацыі прымаючай губерні, каб пазбегнуць накладак [12, с. 42]. Наступнымі падлягалі эвакуацыі дзеці, якія мелі радавы пачатак: башкіры, кіргізы, чувашы, татары [7, арк. 70]. У апошнюю чаргу адбывалася рээвакуацыя сірот.

Відавочны ўнёсак у справу выратавання дзяцей галадаючых губерняў ажыццявілі насельніцтва і кіраўніцтва Віцебскай губерні, якія здолелі прыняць у перыяд з лета 1921 г. па восень 1922 г. 3400 дзяцей [12, с. 38]. Цалкам жа Мінск, Віцебская і Гомельская губерні прынялі каля 13 тыс. дзяцей [13, с. 245]. Гэтыя лічбы даюць падставы адзначыць, што кампанія па дапамозе дзецям галадаючых губерняў была паспяховая. Аднак нельга пакінуць па-за ўвагай праблемы, якія не атрымалася пазбегнуць: бездагляднасць, захворванні і, нарэшце, дзіцячая смяротнасць.

Такім чынам, дзяржаўныя органы і насельніцтва Віцебскай губерні прынялі пасільны ўдзел у кампаніі па выратаванні дзяцей галадаючых губерняў. З самага пачатку прымаліся меры па ўладкаванні эвакуіраваных дзяцей. Для стварэння неабходных умоў утрымання патрабаваліся каласальныя матэрыяльныя сродкі, медыцынскія і педагагічныя спецыялісты. Механізм прыёму дзяцей не быў адладжаны, што выражалася ў шматлікіх праблемах. Часта яны ўтрымліваліся ў неспрыяльных умовах, недастаткова былі забяспечаны вопраткай і харчаваннем. У той момант, калі стала відавочна, што больш немагчыма ўтрымліваць дзяцей на дзяржаўныя сродкі і сродкі ад ахвяраванняў, выйсце было знойдзена ў прыватным патранажы і перадачы дзяцей пад апеку арганізацый і частак Чырвонай Арміі. Ужо з канца 1922 г., калі ў галадаючых губернях быў сабраны ўраджай і ішло аднаўленне гаспадаркі, пачалася падрыхтоўка да рээвакуацыі дзяцей на Радзіму.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Фрумкина, М. Я.* Спасайте детей / М. Я. Фрумкина. – [М.]: Новая Москва, 1923. – 20 с.

2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 570. – Воп.1. – Спр. 20.

3. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 205.

4. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 169.

5. ДАВВ. – Фонд 570. – Воп. 1. – Спр. 11.

6. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 217.

7. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 209.

8. ДАВВ. – Фонд 570. – Воп. 1. – Спр. 32.

9. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 211.

10. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 182.

11. ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 221.

12. *Соловьянов, А. П.* Социальная защита несовершеннолетних в БССР (1921–1930 гг.): [монография] / А. П. Соловьянов. – Минск: Беларус. навука, 2013. – 203 с.

13. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937) / рэд. І. Я. Марчанка [и др.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 694 с.

**(Дата подачи: 12.02.2016 г.)**

*В. В. Бараненка*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*V. V. Baranenka*
National Institute for Higher Institute, Minsk

**УДК 262(476)“1924/1938”**

## ВЫШЭЙШАЕ ЦАРКОЎНАЕ КІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ АБНАЎЛЕНЧАЙ ЦАРКВЫ (1924–1938 гг.)

## HIGHER ADMINISTRATION OF BELARUSIAN RENOVATED CHURCH (1924–1938)

*У артыкуле разглядаецца трансфармацыя вышэйшага царкоўнага кіравання Беларускай абнаўленчай царквы ў 1924–1938 гг. пад уздзеяннем працэсаў як грамадска-палітычнага, так і ўнутрыцаркоўнага характару. Па выніках вывучэння архіўных дакументаў, матэрыялаў перыядычнага друку, а таксама гістарыяграфіі вылучаны чатыры этапы эвалюцыі вышэйшага царкоўнага кіравання аўтаномнай абнаўленчай арганізацыі на тэрыторыі БССР. Даецца характарыстыка вышэйшых абнаўленчых царкоўных органаў і структур.*

*Ключавыя словы: Вышэйшае царкоўнае кіраванне; Беларуская абнаўленчая царква; Руская праваслаўная царква; БССР; Беларускі царкоўны сабор; Беларускі Свяшчэнны Сінод; Прэзідыум; Пленум; Першаіерарх; мітрапаліт; аўтаномія.*

*This article is devoted to transformation of higher administration of Belarusian Renovation Church during 1924–1938 under the influence of socio-political processes as well as processes within the Church itself. Four main stages of evolution of higher church authorities of autonomous renovation organization on the territory of BSSR have been determined on the basis*